4. *Калечиц, Е. Г.* Отчет о полевых исследованиях 1983 г. // ЦНА НАН БЕЛАРУСІ ФАНД. – Арх. № 869. – 24 с., 63 илл., 85 с. колл. оп.
5. Четырехъязычный (русско-англо-франко-немецкий) словарь-справочник по археологии палеолита / С. А. Васильев, Г. Бозински, Б. А. Бредли, Л. Б. Вишняцкий, Е.Ю. Гиря, Ю.Н. Грибченко, М.Н. Желтова, А.Н. Тихонов. – СПб.: 2007. – 264 с.

# ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў АДНОСІНАХ З МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ У ЧАСЫ ЖЫГІМОНТА СТАРОГА

**С. М. Козел**

У гісторыі Вялікага Княства Літоўскага канца XV – пачатку XVI стагоддзяў асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім. На працягу XIV – XV стагоддзяў Вільня і Масква прэтэндавалі на ролю збіральнікаў зямель былой Кіеўскай Русі і супрацьстаялі паміж сабой. Сілы былі роўныя і доўгі час паміж дзяржавамі захоўваўся пэўны статус-кво. Аднак з канца XV стагоддзя пачынаецца экспансія маскавітаў на захад і гэта прыводзіць да шэрагу ваенных сутыкненняў. Першая з войнаў распачалася ў 1487 годзе або ў 1492 годзе (меркаванні гісторыкаў па гэтым пытанні адрозніваюцца) і доўжылася да лютага 1494 года, калі быў заключаны “вечны мір”, які, аднак, не здолеў вырашыць супярэчнасці. У выніку ў 1500 годзе распачалася новая вайна працягласцю тры гады, пад час якой Вялікае Княства Літоўскае страціла значную частку сваіх тэрыторый. У 1506 годзе памёр вялікі князь літоўскі Аляксандр і на прастол узышоў яго брат Жыгімонт Стары. Адразу ж ён быў вымушаны вырашаць дыпламатычныя праблемы, адной з каторых была спроба вярнуць страчаныя ўсходнія землі. Гэта ў наступстве прывяло да шэрагу войнаў з Вялікім Княствам Маскоўскім. Усяго за перыяд праўлення вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога (1506–1548 гады) адбылося тры вайны з Маскоўскай дзяржавай. Завяршэнне кожнага ваеннага сутыкнення патрабавала заключэння міру ці перамір’я. Вырашалася падобнае пытанне пры дапамозе дыпламатычных місій.

Пасольствы па сваім значэнні можна падзяліць на некалькі відаў:

1. Вялікія пасольствы. Адпраўляліся пераважна ў надзвычайным выпадку. Вырашалі праблемы заключэння міру ці перамір’я, ездзілі дамаўляцца аб вызваленні палонных. У склад вялікіх пасольстваў звычайна ўваходзілі найбольш значныя прадстаўнікі магнацкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага.

2. Малыя пасольствы. Вырашалі больш дробныя пытанні, наконт тэрытарыяльных прэтэнзій, іншых спрэчак, часам рыхтавалі спрыяльную

глебу для прыезду вялікіх паслоў. Склад малых пасольстваў залежыў ад значнасці дыпламатычнай місіі.

3. Ганцы. Іх задачы заключаліся ў паведамленні маскоўскіх князёў і баяр аб рашэннях, якія прымаліся радай Вялікага Княства Літоўскага. Ездзілі для атрымання ахоўных грамат для вялікіх паслоў, вырашалі нязначныя пытанні. Ганцамі звычайна прызначалася дробная шляхта.

У Маскву ў складзе пасольства звычайна ездзіла некалькі чалавек, сярод якіх быў пасол, які ўзначальваў місію, яго дарадца і пісар. Іх суправаджала вялікая колькасць слуг. Часта ў розныя місіі ездзілі адны і тыя ж людзі.

Часцей за ўсіх у гэты перыяд у Маскву ездзіў маршалак, пісар Вялікага Княства Літоўскага Богуш Багавіцінавіч, за што быў добра аддзячаны. Ён паходзіў з сям'і валынскага баярына. У 1499 годзе Богуш Багавіцінавіч стаў дзякам, а ў 1504 годзе пісарам Вялікага Княства Літоўскага. Далей, дзякуючы сваёй дзейнасці, ён у 1509 годзе атрымаў пасаду земскага падскарбія, а ў 1510 годзе – гаспадарскага маршалка. Пасля вяртання ў Вялікае Княства Літоўскае з небяспечнай паездкі 1517 года ў Дарагамілаў да вялікага князя маскоўскага Васіля III Богуш Багавіцінавіч атрымаў 600 коп грошай, пацвердзіў правы на сваё ўладанне Доўгі, а пазней атрымаў яшчэ 400 коп грошай і горад Камянец у пажыццёвае трыманне. [4, с. 51-52] У 1522 годзе ён атрымаў яшчэ пасаду слонімскага намесніка. [7, с. 36] Атрыманне новых пасад супадае з яго паездкамі ў Вялікае Княства Маскоўскае. Богуш Багавіцінавіч быў значным дзеячам і набліжаным да Жыгімонта Старога, амаль увесь час знаходзіўся пры двары вялікага князя літоўскага. Ён рыхтаваў шматлікія дзяржаўныя дакументы. Пад час працы ў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага прымаў удзел у правядзенні попісу войска ў 1528 годзе. [7, с. 36] У 1515 годзе нават удзельнічаў у Венскім кангрэсе. А пасля ў 1518 годзе быў адным з прадстаўнікоў пасольства да імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі ў Аўсбург. [2, с. 275] З'яўляўся даволі заможным землеўладальнікам: у 1528 годзе на попіс войска Вялікага Княства Літоўскага выстаўляў 64 коннікі і меў 512 сялянскіх "службаў". [7, с. 36] Богуш Багавіцінавіч быў адным з самых дасведчаных дыпламатаў свайго часу ў Вялікім Княстве Літоўскім, і яго дзейнасць адыграла значную ролю ў адносінах Вільні і Масквы.

Самую першую дыпламатычную місію ў Вялікае Княства Маскоўскае пры Жыгімонце Старым узначаліў у 1507 годзе Ян Мікалаевіч Радзівіл Барадаты. На момант паездкі ён займаў пасаду слонімскага намесніка і гаспадарскага маршалка. У Маскву ездзіў двойчы ў 1507 і 1509 гадах. Першая місія заключалася ў прапанове Жыгімонта Старога падпісаць новы "вечны мір" з Васілём III. Аднак адной з умоў падпісання мірнай

дамовы было вяртанне захопленых Маскоўскай дзяржавай у папярэдніх войнах зямель, якія раней належалі Вялікаму Княству Літоўскаму. Вынік пасольства быў не такім, на які разлічвалі прадстаўнікі Жыгімонта Старога – маскоўскі бок развязаў вайну. Другая паездка была звязана са спробай вяртання палонных, якія знаходзіліся ў маскоўскіх вязніцах. Ян Мікалаевіч Радзівіл пасля сваіх паездак у Маскву ў 1522 годзе стаў троцкім кашталянам. Аднак гэта прызначэнне не было непасрэдна звязана з яго дыпламатычнай дзейнасцю. [3 с. 500]

Разам з Янам Мікалаевічам Радзівілам у Маскву ездзіў Багдан Сапега. Сваю дзейнасць на дзяржаўнай службе ён пачынаў у якасці пісара яшчэ пры вялікім князі Казіміры. Да 1500 года быў намеснікам Мцэнска і Любуцка, а пасля іх захопу маскавітамі стаў смаленскім акольнічым. У Маскву ездзіў два разы ў 1504 і 1507 гадах. Пад час вайны 1507–1508 гадоў Багдан Сапега знаходзіўся ў маскоўскім палоне ў якасці заложніка за сям'ю Міхаіла Глінскага. [3, с. 547]

Увогуле, род Сапегаў быў актыўна ўключаны ў дыпламатычную дзейнасць Вялікага Княства Літоўскага. Братам Багдана Сапегі быў Іван Сямёнавіч Сапега, які таксама з'яўляўся пісарам яшчэ пры Казіміры Ягелончыку. Пры вялікім князі Аляксандры ён пяць разоў ездзіў у Маскву, заключаў перамір'е пасля вайны 1500–1503 гадоў, за што стаў гаспадарскім маршалкам. Удзельнічаў у пасольстве да папы рымскага і магістра Лівонскага (Інфлянцкага) ордэна. Пры Жыгімонце Старым насіў тытул найвышэйшага сакратара Вялікага Княства Літоўскага. У 1508 годзе ўдзельнічаў у чарговым пасольстве ў Маскву. [1, с. 53; 8, с. 384] Шмат у чым дзякуючы яго намаганням, быў падпісаны вечны мір з Маскоўскай дзяржавай. За сваю актыўную дзяржаўную дзейнасць атрымаў шматлікія маёнткі на Браслаўшчыне, Падляшшы і Берасцейшчыне. [3, с. 547] Іван Сапега быў адным з самых вопытных дыпламатаў Вялікага Княства Літоўскага канца XV–пачатку XVI стагоддзя.

Іван Багданавіч Сапега таксама працягнуў шлях свайго бацькі і ўдзельнічаў у дыпламатычных місіях Вялікага Княства Літоўскага. Ён браў удзел у пасольстве ў Маскву ў 1508 годзе ў якасці пісара. Пасля выканання місіі атрымаў пасаду гаспадарскага маршалка. У 1520 годзе стаў віцебскім ваяводай, а праз 9 гадоў і падляшскім. У 1532 годзе ён ужо сам узначаліў пасольства ў Маскву, якое вяло перамовы аб заключэнні мірнай дамовы, аднак толькі працягнула перамі'е паміж дзяржавамі. [5, № 111, с. 36] У 1536 годзе зноў-такі ўдзельнічаў пры падпісанні перамір'я Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага Княства Маскоўскага. [3, с. 547] Па маёмасным становішчы Іван Багданавіч

Сапега быў сярэднім магнатам. У 1528 годзе са сваіх уладанняў мог узброіць 27 коннікаў. [7, с. 56]

Адным з самых таленавітых дыпламатаў Вялікага Княства Літоўскага на пачатку XVI стагоддзя быў полацкі намеснік і ваявода Станіслаў Глябовіч. Ён быў адным з самых запатрабаваных дыпламатаў вялікага князя Аляксандра. У часы яго панавання Станіслаў Глябовіч чатыры разы ездзіў у Маскву. Пры Жыгімонце Старым у 1508 годзе ён разам з Іванам Сямёнавічам Сапегай узначальваў пасольства да Васіля III і ўдзельнічаў у падпісанні вечнага міру. [3, с. 540]

Даволі значным дзяржаўным дзеячам, які таксама апрабаваў дыпламатычную ніву быў Івашка (Іван) Гарнастай. Па маёмасным становішчы ён быў сярэднім шляхцічам, але даволі ўплывовым. Так, у 1528 годзе са сваіх маёнткаў ён выстаўляў у войска 30 коннікаў. [7, с. 56] З 1512 года Іван Гарнастай быў пісарам. Паслом у Маскву быў усяго аднойчы ў 1522 годзе. У хуткім часе пасля гэтага ён атрымаў некалькі дзяржаўных пасад: стаў дзяржаўцай дарсунішскім, даслужыўся да пасады гаспадарскага маршалка і падскарбія. Акрамя таго, трымаў Слонімскае намесніцтва. У далейшым ён стаў дворным маршалкам, а таксама троцкім і віленскім ваяводам. [2, с. 513]

Двойчы ў 1522 і 1526 гадах узначальваў вялікія пасольствы ў Маскву полацкі ваявода (з 1521 года), драгічынскі стараста Пётр Станіслававіч Кішка. Яго першае пасольства было вельмі адказным, бо менавіта яму даводзілася заключаць перамі'е, якое спыняла вайну 1512–1522 гадоў. [5, № 93, с. 32] Затым Пётр Станіслававіч Кішка яшчэ раз ездзіў у Маскву, дзе ўдзельнічаў у пацвярджэнні заключанай раней дамовы аб перамір'і. [5, № 101, с. 33-34] У 1532 годзе ён стаў троцкім кашталянам і жамойцкім старастам. Пётр Станіслававіч Кішка з'яўляўся адным з буйнейшых магнатаў Вялікага Княства Літоўскага: у 1528 годзе выстаўляў у войска 224 коннікі. [2, с. 101]

Значную ролю пад час Старабудскай вайны 1534–1537 гг. адыграў Ян Юр'евіч Глябовіч. Яго палітычная кар'ера распачалася ў 1516 годзе, калі ён стаў гаспадарскім маршалкам. У 1527 годзе Ян Глябовіч становіцца мсціслаўскім і радуньскім дзяржаўцам. Пазней быў віцебскім ваяводам, а з 1532 года – полацкім. У Старадубскую вайну актыўна ўдзельнічаў у баявых дзеяннях, быў разбіты пад Себежам. Аднак ён больш праславіўся на дыпламатычнай ніве. Ян Юр'евіч Глябовіч браў удзел у перамовах з Масквой у 1537 і 1542 гадах. Першы раз узначаліў місію, якая заключыла перамір'е з Маскоўскай дзяржавай, а ў 1542 годзе ездзіў у Маскву, каб працягнуць гэтую дамову. [6, с. 60-62] Пасля прыезду з Вялікага Княства Маскоўскага атрымаў новыя дзяржаўныя пасады: стаў віленскім ваяводам і старастам Бабрускай воласці, а ў 1546 годзе – канцлерам Вялікага Княства Літоўскага. Ян Юр'евіч Глябовіч быў

значным магнатам, які на 1528 год мог выставіць 148 вершнікаў са сваіх маёнткаў і 88 узброеных коннікаў з уладанняў жонкі [2, с. 540]

Прадстаўнікамі сярэдняй шляхты, якія неаднаразова ездзілі ў Маскву, былі два браты Багдан і Станіслаў Даўгірдавічы. Жыгімонт Стары рэгулярна даручаў ім выкананне дыпламатычных місій, аднак цікавым момантам было тое, што гэтыя місіі былі прысвечаны толькі аднаму пытанню. Даўгірдавічам даводзілася вазіць у Маскву граматы аб памежных крыўдах. Па попісу войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года яны выстаўлялі 13 і 8 вершнікаў адпаведна. [7, с. 93]

Акрамя пералічаных вышэй асоб у Маскву ў складзе дыпламатычных місій ездзілі таксама прадстаўнікі родаў Нарбутавічаў, Неміровічаў-Шчытоў, Касцевічаў, Янавічаў і Нарушэвічаў.

Можна закрануць рэлігійную прыналежнасць паслоў Вялікага Княства Літоўскага ўлічваючы тое, што ў дзяржаве сярод магнатаў і шляхты былі пашыраны некалькі хрысціянскіх канфесіяў, а ў Вялікім Княстве Маскоўскім спавядалася толькі адна – праваслаўе. Адназначна сказаць, каму надавалася перавага нельга. У Маскву ездзілі як праваслаўныя шляхцічы, так і каталікі. Нягледзячы на пэўную колькасную перавагу паслоў “грэчаскай” веры, хутчэй за ўсё, перавага надавалася асабістым якасцям дыпламатаў, не звяртаючы ўвагу на іх канфесійную прыналежнасць. Сярод праваслаўных вялікіх паслоў можна назваць наступных асоб: Івана Сямёнавіча Сапегу, Івана Багданавіча Сапегу, Багдана Сямёнавіча Сапегу, Богуша Багавіцінавіча, Івашку Гарнастая. Гаворачы пра паслоў каталіцкага веравызнання, патрэбна ўзгадаць Яна Мікалаевіча Радзівіла, Яна Неміровіча-Шчыта і Пятра Кішку.

Такім чынам, за часы кіравання Жыгімонта Старога ў Маскоўскую дзяржаву накіроўваліся шматлікія дыпламатычныя місіі. Можна назваць шэраг важнейшых прычын адпраўкі пасольстваў: заключэнне міру ці перамір’я, скаргі аб крыўдах на мяжы, патрабаванні вяртання страчаных земляў, вызваленне палонных. Лёс Вялікага Княства Літоўскага непасрэдна залежыў ад прафесіяналізму людзей, якія ездзілі на перамовы. Па гэтай прычыне вялікімі пасламі звычайна станавіліся толькі дасведчаныя ў дыпламатычных справах шляхцічы, з высокім узроўнем адукацыі. Сам удзел у дыпламатычных місіях быў вельмі прэстыжным для дзяржаўных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага. Дыпламатычная дзейнасць спрыяла паспяховай кар’еры. Часта за ўдзел у дыпламатычных місіях ім даваліся маёмасныя падараванні і дзяржаўныя пасады. Большасць паслоў пачынала сваю палітычную кар’еру ў якасці пісараў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага, пасля іх роля ўзрастала, і яны ўжо самі маглі ўзначальваць пасольствы. Добрым прыкладам гэтага можа служыць дзейнасць Івана Багданавіча Сапегі. У 1508 годзе ён удзельнічаў у пасольстве ў Маскву ў якасці

пісара, а ў 1532 годзе ён ужо ўзначаліў сваю першую самастойную дыпламатычную місію. Неабходна адзначыць ролю канцылярыі, праца ў якой дазваляла яе прадстаўнікам зрабіць добрую дыпламатычную кар'еру. Яны былі цесна звязаны з дзейнасцю вышэйшых службовых асоб краіны і самі зачастую займалі дзяржаўныя пасады. Акрамя гэтага, працаўнікі канцылярыі, фактычна, з'яўляліся інтэлектуальнай элітай Вялікага Княства Літоўскага і мелі даволі добрую адукацыю.

Правядзенне перамоў шмат у чым залежала ад унутранай сітуацыі ў дзяржавах. Калі Вялікае Княства Маскоўскае адчувала перавагу над Вялікім Княствам Літоўскім, то паслам дыктаваліся жорсткія ўмовы. Калі ж у Маскве не было палітычнай стабільнасці, то перамовы для прадстаўнікоў Вялікага Княства Літоўскага праходзілі значна лягчэй і хутчэй. У абодвух выпадках былі зусім розныя і адносіны да саміх паслоў. Усяго за час кіравання Жыгімонта Старога ў Маскву для вырашэння важнейшых пытанняў міждзяржаўных адносін было накіравана 10 вялікіх пасольстваў. Што датычыцца сярэдніх і дробных місій, то іх было нашмат больш. У склад вялікіх пасольстваў звычайна ўваходзіла тры-чатыры чалавекі, сярод якіх абавязкова быў пісар. Неабходна адзначыць, што ў Маскву ў якасці дыпламатаў ездзілі адны з самых уплывовых магнатаў Вялікага Княства Літоўскага. Сярод самых значных дыпламатаў дадзенага перыяду можна адзначыць Богуша Багавіцінавіча, Івана і Багдана Сямёнавічаў Сапегаў, Пятра Станіслававіча Кішку, Яна Юр'евіча Глябовіча. Усяго за час праўлення Жыгімонта Старога функцыі вялікіх паслоў выконвалі 16 чалавек. У якасці малых паслоў вылучаліся браты Багдан і Станіслаў Даўгірдавічы, якія ўдзельнічалі ў сямі місіях. У падсумаванні неабходна сказаць, што ўдзел некаторых магнатаў і шляхцічаў у дыпламатычных місіях падвышаў іх аўтарытэт унутры дзяржавы і дазваляў ім прасоўвацца па кар'ернай лесвіцы. Уплываючы на лёс Вялікага Княства Літоўскага, дыпламаты аказвалі ўздзеянне і на асабістае жыццё.

**Літаратура**

1. *Бантыш-Каменский Н. Н.* Переписка между Россиею и Польшею по 1700 год, составленная по дипломатическим бумагам. Ч. I. 1487–1584. М., 1862. – 148 с.
2. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 3 т. Т.1: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; Маст. З.Э. Герасімовіч.- Мн.: БелЭн, 2006. – 792 с.
3. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 3 т. Т.2: Кадэцкі корпус- Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; Маст. З.Э. Герасімовіч.- Мн.: БелЭн, 2006. – 792 с.
4. Литовская метрика = Lietuvos metrika / Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehciklopediju leidykla, 1997. – Кн.11: Книга записей (1518–1523) / [подгот. А. Дубонис]. – 227 с.

5. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским / изданы под ред. Г.Ф. Карпова. Т. 35, (С 1487 по 1533 год). – С.Петербург: Типография Ф. Елеонского и К, 1882. – VI, XXII, 869 с.
6. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским / изданы под ред. Г. Ф. Карпова. Т. 59, (1533 – 1560 г.). – С.Петербург: Типография Ф. Елеонского и К, 1887. – XV, 629 с.
7. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 523. Кн. Публічных спраў 1 / Падрыхт. А.І. Груша, М.Ф. Спірыдонаў, М.А. Вайтовіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 444 с.
8. Полное собрание русских летописей. Т. 6. Вып. 2. Софийская вторая летопись. / Подг. текста С.Н. Кистерева и Л.А. Тимошиной, предисл. Б.М. Клосса. М., ЯРК. 2001.– 240 с.

## УКРАІНСКАЕ ЭТНАДЗЯРЖАЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ (КАНЕЦ XIX – ПЕРШАЯ ПАЛОВА 20-Х гг. XX ст.)

**С. Л. Лазнюха**

У сувязі з далучэннем да Расійскай імперыі буйных далёкаўсходніх тэрыторый па Айгунскай, Таньцзынскай дамовах 1858 г. і Пекінскай дамове 1860 г. узнікла вострая неабходнасць каланізацыі новых абшараў славянскім насельніцтвам. Засяленне і гаспадарчае асваенне Далёкага Ўсходу пачалося яшчэ з 1850 г., але да 1883 г. каланістамі былі пераважна жыхары суседніх сібірскіх губерняў. Становішча змянілася ў 1883 г. з адкрыццём рэгулярнага марскога спалучэння паміж Адэсай і Уладзівастокам. Генерал-губернатар Усходняй Сібіры Д. Анучын у 1882 г. запрапанаваў для паскарэння засялення Паўднёва-Усурыйскага краю перасяленцамі з Еўрапейскай Расіі арганізаваць перавозку сялян морам за дзяржаўны кошт [2, с. 66), ужо ў наступным годзе праз Адэскі порт да Паўднёва-Усурыйскага краю выбыла першая партыя навасёлаў [2, с. 66].

За данымі Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва СССР, якія падае ў сваім артыкуле У.М. Кабузан, на працягу 1883–1905 гг. на Далёкі Усход перасяліліся 166 384 асобы. З іх на губерні Украіны прыпадала 109 510 чал, або 65, 82 % [2, с. 67]. У 1906–1916 гг., то бок у перыяд правядзення аграрнай рэформы П. Сталыпіна, тэмпы засялення і гаспадарчага асваення Далёкага Усходу яшчэ больш павялічыліся. Права на перасяленне атрымалі ўжо і маламаёмасныя пласты сялянства, бо царскі ўрад свядома заахвочваў перавядзенне сельскай беднаты на ўскраіны дзяржавы [2, с. 68].

Усяго на працягу 1906–1916 гг. на Далёкі Усход прыбыло (без уліку тых, якія вярнуліся) 259 522 асобы. Украінскія перасяленцы складалі ў гэтай колькасці 166 787 чал. або 64, 27 %. ў засяленні і гаспадарчым